# Людзі – гэта самае каштоўнае… : маральная праблематыка рамана "Сэрца на далоні"



- Раман “Сэрца на далоні” пісаўся адначасова з пенталогіяй “Трывожнае шчасце”. Іван Шамякін працаваў над раманам "Сэрца на далоні" ў 1960 - 1963 гадах. Спачатку твор быў надрукаваны ў часопісе "Полымя", а ў 1964 годзе з'явілася яго асобнае выданне. Па словах аднаго з галоўных герояў рамана журналіста Кірыла Шыковіча, гэта быў час "перавароту ў мазгах".









# Характарыстыка часу

- Менавіта другая палова 50-х і першая палова 60-х гадоў сталі часам перамен у грамадстве, часам выкрыцця культу асобы Сталіна, аднаўлення ленінскіх (на тыя гады — дэмакратычных) нормаў жыцця. Нездарма гэты час назавуць "хрушчоўскай адлігай", бо сапраўды пасля XX з'езда КПСС (1956 год) у грамадстве "пацяплела": адбывалася своеасаблівае "ўзвышэнне чалавека", зварот да паказу жыцця простых людзей, іх надзённых клопатаў, удзелу ў грамадскім жыцці. Многія ў гэты час праніклісь верай у магчымасць пабудовы ў дзяржаве самага справядлівага камуністычнага грамадства, усе члены якога будуць жыць па прынцыпах маральнага кодэкса будаўніка камунізму. Пісьменнікі шмат пісалі пра тое, што быць будаўніком новага грамадства абавязаны кожны грамадзянін, што не можа ў справядлівым грамадстве быць звычайных, "простых" людзей і людзей асаблівых, кожны чалавек варты ўвагі і павагі.

# Праблематыка твора

- адказнасць чалавека за сябе і свае ўчынкі;
- удзячнасць і чалавечнасць;
- служэнне людзям і вернасці сваёй сям'і, сяброўству;
- праблема бацькоў і дзяцей і адказнасці за будучыню нацыі – моладзь…
- жаданне ведаць праўду пра недалёкае — ваеннае і пасляваеннае — мінулае і надзеі на сапраўдную дэмакратызацыю ўсёй сістэмы грамадскага жыцця.

Жыццё сямейна-бытавое, грамадскае, палітычнае, яго глыбінны сэнс і цэласная плынь становяцца зместам рамана Шамякіна пра перабудову, пра новае, пра маральнае ўдасканаленне людзей, пра вечна прыгожую, прасвечаную сонцам, расквечаную фарбамі прыроду.



# Канфлікт у рамане

- Барацьба паміж журналістам Шыковічам і старшынёй гарсавета Гуканам, якія калісьці разам напісалі кнігу пра падполле. Цяпер жа адзін з іх, Шыковіч, імкнецца перапрацаваць раней напісанае, таму што не ўсё ў ёй — праўда. Гукан усяк праціўіцца гэтаму, ён не жадае раскрываць праўду пра мінулыя падзеі, бо гэта — праўда пра яго, такая праўда, якую яму не хочацца ні чуць, ні расказваць. Асабліва баіцца ён, што адкрыецца праўда пра доктара Савіча і яго дачку Зосю, што азначае маральную смерць для Гукана.

# Сюжэтныя лініі рамана

- узаемаадносіны былых сааўтараў кнігі пра падполле, некалі сяброў, а цяпер непрымірымых ворагаў Шыковіча;
- сюжэтная лінія бацькоў і дзяцей, якая раскрывае адносіны паміж сталым і маладым пакаленнямі герояў;
- сюжэтная лінія "Яраш - Зося" звязвае сучаснае з мінулым, сведчыць пра імкненне сумленных людзей дапамагаць тым, хто трапляе ў бяду;
- Галоўнай з'яўляецца лінія "Шыковіч - Гукан", астатнія, нібы галіны ад ствала, адыходзяць ад яе, падпарадкоўваючыся ёй, дапаўняюць і развіваюць асноўную. **Чаму?**




# ДЗ

Падабраць цытаты да ілюстрацый Гершковіча

# Ілюстрацыі Юрыя Саламонавіча Гершковіча да кнігі Івана Шамякіна «Сэрца на далоні»






















